*Список литературы*

1. Маркарян, Э. С. Культура жизнеобеспечения и этнос. Опыт этнокультурологического исследования / Э. С. Маркарян, С. А. Арутюнов. – Ереван : Изд-во АН АрмССР, 1983. – 319 с.
2. Шацкий, Е. О. Утопия и традиция / Е. О. Шацкий ; пер. с пол. К. В. Душенко, М. И. Леньшина / общ. ред. и послесл. В. А. Чаликовой. – М. : Прогресс, 1990. – 543 с.

We consider the interaction of tradition and innovation, as elements of culture, the concept, functions, properties of tradition, the mutual influence of these categories in the process of historical development.

***Коляго Алла Васильевна,*** старший преподаватель кафедры изобразительного искусства, ГрГУ им. Я. Купалы, г. Гродно

УДК 78(079);78.07;785;788,91

**А. Л. Карацееў**

## СТАРАДАЎНІЯ БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ДУХАВЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ ЯК АРТЭФАКТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ, СУСВЕТНАЙ МАСТАЦКАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ: У КАНТЭКСЦЕ КАМПАРАТЫЎНАГА І ЭТНААРГАНАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ

Рассматривается социокультурная, функциональная и этноорганологическая особенность традиционных народных духовых музыкальных инструменов белорусов. Акцентируется внимание на необходимости массового изготовления такого инструментария, предлагаются конкретные пути решения его популяризации.*

Любы з артэфактаў, асабліва датаваны раннім перыядам, уяўляе асаблівую цікавасць для даследчыкаў, таму што ён выступае і як носьбіт сацыяльна-культурнай інфармацыі, і як жыццёва-сэнсавая інфармацыя, і як сродак камунікацыі. Сваё даследаванне ў кантэксце кампаратыўнага і этнаарганалагічнага аналізу мы прысвяцілі вывучэнню старадаўніх беларускіх народных духавых інструментаў, якія выступаюць як артэфакты нацыянальнай, сусветнай мастацкай і музычнай культуры. Вывучэнне пытанняў эвалюцыі, існавання і выкарыстання ў музычнай практыцы музычных інструментаў заўсёды прыцягвала музыкантаў-выканаўцаў, музычных майстроў, энтузіястаў-рэстаўратараў старажытных музычных інструментаў, спецыялістаў па вывучэнні спецыфікі музычнай акустыкі, выкладчыкаў музычных дысцыплін і г. д. У гэтым кірунку неабходна адзначыць аўтараў цікавых прац, сярод якіх арганолагі і музыказнаўцы Г. Благадатаў, К. Вярткоў, Э. Язавіцкая, А. Гумянюк, Г. Хаткевіч, О. Эльшак, А. Чарных, Эрых М. фон

* Аннотация дана на русском языке для расширения читательской аудитории.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хорнбастэль і К. Закс, даследчык музычнай акустыкі В. Парвенкоў і інш. Улічваючы павышаную цікавасць да духоўнай, мастацкай спадчыны Беларусі, народнаінструментальнай музычнай культуры, пытанняў існавання народных музычных інструментаў, у тым ліку і духавых народных музычных інструментаў, да гэтых праблем звярнуліся і даследчыкі Беларусі. Сярод тых, чые працы ў значнай ступені акрэслілі працэс фарміравання і асаблівасці існавання народнага музычнага інструментарыю, у тым ліку і духавога, заклалі падмурак нацыянальнай этнаарганалогіі, неабходна адзначыць У. Бярберава, У. Грома, Г. Мішурова, І. Назіну, Н. Прывалава, Н. Яканюк. Так, напрыклад, І. Назіна ажыццявіла сістэматызацыю беларускіх найгрышаў [1], напісала манаграфію, якая была прысвечана беларускім народным музычным інструментам [2]. Даследчык музычнай спадчыны беларусаў і апантаны музыка У. Гром прааналізаваў функцыянаванне дуды ў фальклорна-інструментальнай творчасці беларусаў [3, с. 81–86]. Шэраг цікавых сведчанняў аб гісторыі і функцыянаванні беларускіх народных духавых музычных інструментаў былі адлюстраваны і намі ў асабістых навуковых працах [4–7]. З мэтай не толькі папулярызацыі, а таксама і актывізацыі цікавасці да засваення беларускіх народных духавых музычных інструментаў А. Крамко быў падрыхтаваны вучэбны дапаможнік [8]. Беларускія народныя духавыя музычныя інструменты былі адлюстраваны ў работах К. Машынскага [9] і Ч. Пяткевіча [10].

Сярод розных праблем развіцця духавой музыкі Беларусі як адзін з прыярытэтных накірункаў, як аб’ект даследавання намі была вызначана праблема існавання і развіцця народнага духавога музычнага інструментарыю. Гэту праблему можна разглядаць ў двух кірунках: 1) праблемы рэканструкцыі, вырабу старажытных беларускіх народных духавых інструментаў (захаванне канструктыўных асаблівасцей і мастацка-выразных якасцей музычных інструментаў); 2) укараненне старажытных духавых музычных інструментаў у сучасную музычную культуру Беларусі (сольнае, ансамблевае выкананне). Неабходнасць менавіта такога падыходу абумоўлена зацікаўленасцю вывучэння гісторыі развіцця старажытных беларускіх духавых музычных інструментаў і неабходнасць яго адраджэння музычнымі майстрамі-рэстаўратарамі, музыказнаўцамі і музыкантамі-практыкамі (кіраўнікі мастацкіх калектываў, асобныя выканаўцы і г. д.) .

Разгледзім першы адзначаны кірунак. Вывучэнне праблемы існавання народнага беларускага духавога інструментарыю паказала, што праблемы рэканструкцыі, вырабу старажытных беларускіх народных духавых інструментаў на сённяшні дзень з’яўляюцца вельмі актуальнымі. Гэта звязана з папулярызацыяй народна-песеннага, народна-танцавальнага і народна-музычнага мастацтва, развіццём мастацкіх калектываў, у якіх існуе дэфіцыт гэтых інструментаў, таму што майстры-рэстаўратары маюць магчымасць выраблячь толькі адзінкі народна-духавога інструментарыю. Кірункі вырашэння гэтага пытання могуць быць наступнымі: 1) стварэнне лабараторыі, спецыялісты якой па гістарычных дакументах (архіўныя крыніцы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малюнкі і да т. п.) змаглі б зрабіць дасканалае апісанне канструктыўных дэталяў таго ці іншага музычнага інструмента; 2) музыкантамі-акустыкамі і тэхнолагамі пачата распрацоўка старажытных беларускіх народных духавых інструментаў, якія адпавядаюць лепшым гістарычным акустычным канструктыўным узорам. Тэма даследавання беларускіх народных музычных інструментаў «Распрацоўка тэарэтычных асноў адраджэння дуды і трубы: семантыка вобраза, акустыка, дызайн, тэхналогія вырабу, рэпертуар, методыка навучання ігры» была распрацавана А. Карацеевым і І. Мангушавым у межах дзяржаўнай праграмы «Культура». Звярнемся да разгляду такіх старажытных беларускіх народных духавых інструментаў, як дуда, жалейка, труба і акарына. Дуда – гэта язычковы музычны інструмент, дзякуючы якому сярод духавых музычных інструментаў упершыню была зроблена спроба аб'яднаць некалькі музычных гукаў у гарманічнае адзінае цэлае. У гэтым музычным інструменце адначасова могуць гучаць да шасці бурдонаў з жалейкай. Інструмент дуда выкарыстоўваўся ў старажытных абрадах, якія ўзніклі яшчэ ў час прыручэння жывёл, і як музычны інструмент дуда атрымала шырокае распаўсюджанне на Беларусі. Дуда звязана з міфічным вобразамі казы або лебедзя. Але напрыканцы XIX стагоддзя гэты інструмент выйшаў з ужытку па розных аб'ектыўных прычынах, і на сённяшні час, нягледзячы на тое, што дуды вырабляюцца рознымі майстрамі, гэтых традыцыйных музычных інструментаў вельмі недастаткова. Жалейка – гэта традыцыйны на Беларусі народны язычковы духавы музычны інструмент. Ён вырабляўся з розных матэрыялаў: дрэва, чароту, саломы, кмену. У залежнасці ад матэрыялу інструмент атрымаў адпаведную назву (чаротка, саломка, кменка). Жалейка – гэта сімвал кахання, любові, урадлівасці (рог урадлівасці). Адна з разнавіднасцей жалейкі – чаротка, што адпавядае сувязі з аднакаранёвымі словамі *чараўнік, чараваць, чарка*. Другая разнавіднасць жалейкі – саломка, якая нагадвае збожжа (хлеб). Труба – гэта старажытны народны музычны інструмент, на якім гук атрымліваецца пры дапамозе мундштука. У старажытныя часы гэты інструмент быў шырока распаўсюджаны ў вайсковай сігнальнай практыцы. На Беларусі трубы выраблялiся з алешыны, бярозы, елкі, хвоі. Акарына – гэта паслядоўніца гліняных свістулек, якія ўвасабляюць сабой жывёльны эпас беларускага народа. Яна мае рэзанатарную поласць ямкападобнай формы і свістковае прыстасаванне. Знешні выгляд акарыны нагадвае вобраз гуся. У адрозненне ад звычайных духавых інструментаў, дзе вібрыруе паветраны стоўб, у акарыне гучанне ажыццяўляецца непасрэдна вібрацыяй унутранага аб'ёму паветра інструмента. Гучыць інструмент празрыста, мякка ці звонка ў залежнасці ад формы, імітуе спеў птушак ці розных фантастычных істот.

Рэалізацыя праграмы «Распрацоўка тэарэтычных асноў адраджэння дуды і трубы: семантыка вобраза, акустыка, дызайн, тэхналогія вырабу, рэпертуар, методыка навучання ігры» можа заключацца ў наступным: а) большасць беларускіх народных музычных інструментаў, у тым ліку труба

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і дуда, знаходзіцца на этнаграфічным узроўні. Таму неабходна мэтанакіраваная праца па вырабе гэтых інструментаў на прафесійным узроўні; б) ва ўсім свеце выраб музычных інструментаў ажыццяўляецца індустрыяльным метадам, у аснове якога ляжыць спалучэнне навуковых пошукаў і сучасных тэхналогій; в) даследаванне семантыкі вобраза дуды і трубы будзе спрыяць асэнсаванню месца гэтых інструментаў у музычнай культуры. На гэтай падставе магчыма будзе вызначыць шляхі развіцця інструментаў у будучым. Акустычныя даследаванні дазволяць удасканаліць гук інструментаў, выявіць нацыянальны гукаідэал. Падрыхтоўка рэпертуарных зборнікаў і распрацоўка методыкі навучання створаць умовы да шырокага адраджэння інструментаў у мастацкім жыцці Беларусі; г) аб'ект распрацоўкі узорныя інструменты, дызайн інструментаў, рэпертуарныя зборнікі, спецыяльныя прысады для вырабу інструментаў, музычныя праграмы, музейныя экспазіцыі; д) вырашэнне задачы стварэння прафесійных дуды і трубы. Адзначым, што пераход этнаграфічных інструментаў – трубы і дуды – у сферу прафесійнага мастацтва, патрабуе напружанай працы, якая павінна насіць сістэмны характар і дзяржаўную падтрымку. Нармальнае функцыянаванне прафесійнага інструмента ў мастацкай культуры Беларусі магчыма толькі пры наяўнасці адпаведнага рэпертуару, неабходнага метадычнага забеспячэння і засваення яго музыкантамі.

Разглядаючы другі кірунак укаранення ў сучасную музычную культуру Беларусі беларускіх народных духавых музычных інструментаў, адзначым, што ён узаемаабумоўлены першым разгледжаным кірункам і папулярызацыяй народна-інструментальнай спадчыны беларусаў. Але пытанне распаўсюджання беларускіх духавых народных музычных інструментаў вельмі складанае і патрабуе вырашэння наступных задач: 1) правядзенне сацыялагічнага даследавання па выяўленні неабходнасці распаўсюджання старажытных беларускіх духавых музычных інструментаў (сацыякультурныя, колькасныя і г. д.); 2) правядзенне назірання, інтэрв'ю з удзельнікамі і кіраўнікамі аматарскіх мастацкіх калектываў з мэтай выяўлення неабходнасці ўкамлектавання танцавальных, харавых, інструментальных калектываў старажытным беларускім духавым музычным інструментарыем. Дзякуючы намаганням выкладчыкаў кафедры духавой музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва сярод кіраўніцтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь было знойдзена паразуменне па праблемах рэканструкцыі, вырабу старажытных беларускіх народных духавых інструментаў і іх укаранення ў сучасную музычную культуру Беларусі. На кафедры духавой музыкі былі рэканструяваны ўзоры такіх старажытных беларускіх народных духавых інструментаў, як акарыны (розных страёў), дудкі, жалейкі, дуды, доўгія драўляныя беларускія народныя трубы (асноўныя строі). Значнае знаёмства з разнастайным беларускім народным духавым інструментарыем адбылося 28 красавіка 2000 года на справаздачным канцэрце кафедры духавой музыкі, прысвечаным 25-годдзю Беларускага



РЕПОЗИТОРИЙ БрГУ

дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, у канцэртнай зале клуба імя Ф. Дзяржынскага. Паказ старажытных беларускіх народных духавых музычных інструментаў пачаўся з выступлення ансамбля старажытных беларускіх народных драўляных труб пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь У. Грома, які зацікавіў слухачоў сваім незвычайна-спецыфічным старажытна-чароўным гучаннем у музычнай кампазіцыі «Ой, рана, рана, сонца зайграла», якую спецыяльна да прэм'еры гэтага ансамбля напісаў дацэнт кафедры духавой музыкі І. Мангушаў. Нават асобнае – сольнае выкананне, а таксама ансамблевае і капэльнае выкананне на традыцыйных народных духавых музычных інструменах беларусаў дазваляе раскрыць усю самабытнасць гэтага ўнікальнага музычнага інструментарыю. Яго вывучэнне і аналіз у кантэксце кампаратыўнага даследавання дазволіць даць дадатковую ацэнку шырыні творчага вектара, функцыянальным асаблівасцям інструментаў, арганічнае спалучэнне ў розных выканальніцкіх формах сумеснага музыцыравання з мастацкімі калектывамі (фальклорныя вакальныя ансамблі і народныя харавыя калектывы, народныя танцавальныя калектывы, народныя інструментальныя ансамблі і аркестравыя калектывы). Падцвярджэннем перспектыўных навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры духавой музыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, акустычных, арганалагічных і канструктыўных пошукаў майстроў-рэстаўратараў па адраджэнні старажытнага беларускага музычнага духавога інструментарыю з'яўляюцца паспяховыя выступленні ансамбляў, якія аб'ядналіся пад гучныай назвай «*Гуды*» на Міжнародных Фестывалях народнай музыкі ў Паставах і на X міжнародным Фестывалі народнай творчасці «*Жыцень-2000*». Нягледзячы на гэтыя поспехі, выкладчыкі кафедры павінны вырашыць яшчэ шмат праблем і пытанняў па рэканструкцыі, вырабе старажытных беларускіх народных духавых інструментаў, іх укараненні ў сучасную музычную культуру Беларусі і падрыхтоўку кваліфікаваных і апантаных выканаўцаў на гэтых традыцыйных музычных інструментах беларусаў.

*Спіс літаратуры*

1. Белорусские народные наигрыши / сост. и авт. вступ. ст. И. Д. Назина ; под общ. ред. В. Петрова. – М. : Музыка, 1986. – 12 с.

2. Назіна, І. Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

3. Гром, У. М. Дуда ў фальклорна-інструментальнай творчасці беларусаў / У. М. Гром // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Минск : Бестпринт, 2004. – С. 81–86.

4. Коротеев, А. Л. Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А. Л. Коротеев // IV міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 1998 г. У 2 ч. Ч. 2 / ЕГУ, БУК ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. ред.) [і інш.]. – Минск : Белорус. ун-т культуры, 1999. – С. 168–176.

5. Коротеев, А. Л. Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А. Л. Коротеев // Украіньска культура в іменах і дослідженнях. Наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Віп. ІІІ. – Рівне : Рівненський держ. ін-т культури, 1998. – С. 296–320.

6. Коротеев, А. Л. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев // X міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66–72.

7. Карацееў, А. Л. Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А. Л. Карацееў // Веснік Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.

8. Крамко, А. Я. Беларускія народныя духавыя інструменты : вучэб. дапам / А. Я. Крамко. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.

9. Moszynski, K. Polesie Wscodnie. Materijaly etnograficzhne z wscodniego czessci b. Powiatu Mozyrskiego oraz z powiatu Rzeczyckiego. – Warzawa, 1928. – 304 s.

10. Pietkiewicz, Cz. Polesie Rzecsyckie. Cz. 2. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego: Materijaly etnograficzhne. – Warzawa, 1938. – 459 s.

The article considers the sociocultural, functional and ethno-organological peculiarities of the traditional folk wind musical instruments of Belarus. The author focuses on the need for mass production of such tools, offers concrete ways to solve its popularization. The material of the article largely complements the information presented by the author in his publications included in the list of references.

***Карацееў Аляксандр Леанідавіч,*** кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар кафедры духавой музыкі БДУКМ, г. Мінск.

УДК 7.01

**Б. М. Лепешко**

## ЧИТАЯ РОЗАНОВА: СОЦИОЛОГИЯ ЭСТЕТИКИ

Рассматриваются некоторые элементы социологии эстетики В. В. Розанова. Обосновываются такие положения, как сознательный отказ от позитивизма, догматических схем в пользу постоянного движения мысли, оперирование категориями «интимное», «пол», «семья». Показана роль литературы в общественно-политическом процессе, влияние идей мыслителя на современный литературный процесс.

Очевидно, обращаясь сегодня к творчеству такого крупного русского писателя второй половины 19 – начала 20 века, как Василий Розанов, имеется в виду некая затаённая цель, сверхзадача, достижение, реализация которой связана и с нашим временем. Иначе – зачем? Тем более что о Роза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ